# Спартыўная я – спартыўная мая гімназія – спартыўная мая краіна!




Усе мы ведаем, што спорт дае нам сілу, упэўненасць у сабе, радасць перамог. Але трэба займацца лепш і лепш, штодзённа імкнуцца да мэты. Часцей за ўсё людзі займаюцца на стадыёнах, якія настройваюць іх на далейшыя перамогі. Бо там асаблівая атмасфера.

Я ведаю мноства вялікіх стадыёнаў, але найбольш мне падабаюцца два. Гэта наш школьны стадыён і стадыён “Нёман”. Захапляюся нашым гімназічным стадыёнам. Па ўсім горадзе такога не знойдзеш! Сучаснае пакрыццё, футбольнае поле, пляцоўка для заняткаў баскетболам, валейболам. Усё гэта ў распараджэнні не толькі вучняў, але і ўсіх жадаючых быць здаровымі і спартыўнымі. Наш стадыён – сумесны міжнародны праект. Ён доўжыўся чатыры гады. Такі стадыён ёсць яшчэ адзін у нашых суседзяў. Зараз мы працягваем супрацоўніцтва са школамі Алітуса, ездзім да іх у госці на спаборніцтвы і прымаем іх у сябе.

А непадалёку ад нашай гімназіі размясціўся гарадскі стадыён “Нёман”. Ён мара ўсіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Гэты вялікі стадыён – гонар гарадзенцаў. Ганарымся мы і сваімі спарцменамі.

У гэтым годзе Беларусь прымае Другія Еўрапейскія Летнія гульні. І я цяпер, калі бачу нашы стадыёны, адразу адчуваю радасць у душы. Уяўляю, што чую, як шумяць, гудуць стадыёны алімпійскіх гульняў. Мне здаецца, што сярод балельшчыкаў – я, мая сям’я, мае аднакласнікі. Усе мы балеем за лепшых, моцных, самых-самых! І перамагаем! Я нават напісала пра гэта верш.

## Радасць перамогі

Алімпіяда!
Гудзе стадыён.
І на трыбунах шум і гамонка...
То, як прыбой, уздымаецца ён,
То замірае цішаю звонкай.
Дух барацьбы ўсіх бярэ ў палон,
І адступаюць страх і трывога.
Тут трэніровак бачыцца плён,
Шчасце рэкордаў і перамога.
Тут узыходзяць на п'едэстал,
Поўныя новых мар і надзей,
А перамога, як новы старт,
Радасцю поўніць сэрцы людзей.

**Ярашэвіч Таццяна**
*Гімназія №2, 6 "Л" клас*